




людміла
паўлікава

ТВАЁ СВЯТЛО

людміла пaўлікава



ТВАЁ СВЯТЛО

Вершы

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1988

ББК 84 Бел 7
П 12

Рэцэнзент
УЛАДЗІМІР ВАСІЛЕВІЧ

Нежная и гордая, искренняя и переменчивая, спокойная и бунтующая, неукротимая, со звонкими всплесками радости и глухими перекатами печали — такова мелодия души лирической героини сборника стихотворений «Твой свет».

П $\frac{4702120200-069}{М\ 302(03)-88}$ 57—88

ISBN 5-340-00057-5

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1988.

СЫНЫ

*На адкрыццё помніка
ў вёсцы Літавец*

Па сёння растуць на Зямлі камяні —
з полымя,
гневу,
болю.
Не помнікі гэта —
Айчыны сыны
вяртаюцца з поля бою.
Стук сэрца,
званы,
палымяны набат,
плач каменя... Доля, злітуйся!
Мы чуем вас —
Аджымушкай,
Хатынь,
Бухенвальд,
вас,
Саласпілс
і Літавец.
Мы ўсталі з крыві бессмяротных сыноў,
з травы,
дзе кіпелі росы,
з руін старажытных сваіх гарадоў,
мы —
з попелу спаленых вёсак.
Мы знаем,
мы помнім,
як плаціць Зямля
няшчаднай вайне даніну.
Праз колькіх жанок нарадзілася я —
каб свету даверыць
сына!

І кожная з іх
паўстае ва мне —
Любоў,
Сцепаніда,
Каця...
І кожная з нас —
гэта боль і гнеў,
бяздушнай вайне пракляцце.

Ды попел не спаліш.
Мы ўсталі з руін.
І кроў — бессмяротнай крыві мы.
Растуць неўміручымі нашы сыны —
каменныя
і жывыя.

* * *

Ёсць хлеб у нас. І ёсць да хлеба-солі.
На свята Перамогі давідна
Віншуем ветэранаў у застоллі
І дзякуем, што знішчана вайна.

Вітаем на трыбунах ветэранаў.
А пройдзе свята — як нам не да іх!
А іх яшчэ штодня трывожаць раны,
Яшчэ штоноч ім трызняцца баі.

Рэгламент жорсткі ў нашага жыцця.
Трымае нас рэгламент пад абцасам.
І мы бяжым парой ад пачуцця,
Чуллівасці саромеемся часам.

А чым — ну чым жыццё тады багата?
Дзе дабрыня засне — прачнецца зло.
Няўжо, скажы, да выпадку, да свята
Замкнёная скарбонка добрых слоў?!

Згадаю, нехта горача акрэсліць:
— Ды я для іх апошняе аддам! —
А побач бацька нахіліўся ў крэсле.
Задумаўся. Ён на вайне. Ён — там!

Яшчэ не позна. Слухай, чалавеча,
Ты падыдзі і абдымі яго за плечы,
Скажы без прабачэння за парыў:
— Я дзякую за тое, што дажыў,
Што ў цяжкі час падняў мяне, малечу...

Усё скажы, што здолееш знайсці
У памяці, у нашай мове спеўнай,
Усё, што я пры бацькавым жыцці
Аднойчы не змагла... і не паспела.

У КЛІЧАЎСКІХ ЛЯСАХ

Памяці бацькі, партызана,
ветэрана Вялікай Айчыннай

На зары ў неба сіняе-сіняе
Па імхах партызанскіх сцяжын
Сонца выкацяць рогі ласіныя,
Трубны гук запануе ў цішы.

Следам рэмез шчымліва-танюсенька
Абзавецца, чаруючы слых.
Скіне росы даспелыя бусельнік
З парасонаў-сукавеццяў сваіх.

Падыду да старое лясіны я,
Прытулюся. «Ты помніш...» — скажу.
На зары ў неба сіняе-сіняе,
Нібы ў бацькавы вочы гляджу.

БАЛАДА
ПРА НАРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСІ

У сівой даўніне,
Дзе губляецца летапіс часу,
Дзе народы Зямлі
І паданні пачатак бяруць,
Кінуў вокліч гусляр:
— Як, Радзіма, назваць цябе шчасна?
З трох бярозак адна
Адгукнулася:
— Белая Русь!

І паверыў гусляр,
І распраміў магутныя плечы,
Ціха струны крануў:
— Помні славу сваю, беларус!
Мы прынеслі яе
З поля Неўскай і Грундвальскай сечы,
Каб жыла — у вяках! —
Наша вольная — Белая Русь.

А калі наш магнат
Выракаўся народа і веры
І Ягайла ў Літве
Ладзіў з Польшчай вясельны хаўрус,
Мы за праўду сваю
Паўставалі з агнём і сякерай,
Каб жыла — у вяках! —
Наша мужная — Белая Русь...—

Так спяваў той гусляр.
І сягоння ў бярозавым гаі
Прыпыніся на міг,

Цішыню на зары не паруш
І пачуеш тады,
Як нябачныя гуслі іграюць,
Горды голас звініць:
— Помні славу сваю, беларус!..



РОЗДУМ
У КРАЯЗНАЎЧЫМ МУЗЕІ

Прашчур прыжмурыўся,
Прашчур прыцэліўся —
Спеліўся стрэл
У сягоння з мінуўшчыны.
Здарыўся стрэл.
І вякі разляцеліся,
А цеціва —
Цеціва не адпушчана.

Край легендарны
Нязломнага Вітаўта,
Вешчага Яна [1]
І лепшай абранніцы,
Гордае мовы —
Вякамі выгнанніцы —
Ледзь не забітае,
Ды не забытае!

Лебедзі-гусі
Над казачнай пушчаю
Вольна плывуць
З даўніны распавітае,
Час вымяраюць
Стралою не пушчанай
Вечныя людзі
Зямлі старажытнае.

---

[1] «...но Вельтманъ полагаетъ, что это не Боянъ (у «Слове пра паход Ігаравы».— *Л. П.*) — а Янъ... частица бо, ибо очень часто подставлялась къ речи: «Тый бо Олегъ», «уже бо братіе»; такъ и «Бо Янъ въешчій»...» — (Даль В. Толковый словарь живого великорусского языка. В 4-х т. Т. 1. М., 1981. С. 114).

ПЕСНЯ ВЕЧНАГА ЦЫГАНА

Паводле біблейскага падання

Так, я — цыган.
Навошта мяне ганьбіць?
Я зух-каваль,
маэстра ў справах гандлю,
Чарнёны ветрам.
Ну, званчэй, гітара!
Я сокал табара
і я груган базара.

Так, я цыган.
Падчас хлушу, хітрую,
Краду я коней,
разам з імі збрую,
Але ж люблю я іх!
Любоў — мая віна,
Вастрэй за нож яна
у цыгана
У сэрца
гордым джалам уваходзіць.
Ды што мы пра любоў?
Гітара, годзе!
Цыган жывы
не да астрога ці труны,
Ён — песня
да апошняе струны,
Апошняе,
як судны дзень Пампеі!
Але, гітара,
мы яшчэ не спелі.
А безгалосую —
удруз цераз калена
І прэч з жыцця,
як недарэчнай сцэны!

Так, я цыган!
Чым болей мне пагана,
Тым весялей, гітара,
жар цыгану!
Відаць, абраў свой лёс
я ў час адчаіны.
Звінела невыноснае маўчанне,
Гарбаціў гнусна
кручканосы профіль
Вяршыні здрадніцтва,
імя якой — Галгофа!
Там прада мной
на крыж, нібы скрыжалі —
Жывога чалавека прыбівалі.
Цвікамі.
Вы падумайце — жывога!
Яго, смяротнага яшчэ,
яшчэ не бога!
Бабіны слёз драбіліся на вейках
Не ў маці бога —
маці чалавека.
Адзіны сын.
Як гэты свет — адзіны!
Яна багоў кляла,
свае радзіны,
І, спасцігаючы пакуты ўсе зямныя,
Крычала, білася
у сутаргах Марыя.
Так, я каваль.
Але цвікоў праклятых
я не каваў!
І як я тым багаты!
Так, я гандляр.
Гандлюю адмыслова
Сваім і крадзеным,
прадам я нават слова,


Але душы сваёй або чужое
Не прадаваў
ні мёртвай, ні жывое!

Не я цыган!
На вылюдкаў праклятых
Рвануў я нож!
Але сказаў пагляд мне:
«О, што жыццё?! Што смерць, яе пакуты?!
Сябрамі я прададзены, прыкуты...»
І я спыніўся,
праўда, грош цана,
Як лопнула апошняя струна!
Стаю бліжэй за ўсіх,
бялей ад смерці,
Застаўся цвік —
апошні цвік —
у сэрца!

Вось набліжаюцца.
Канец — адзіным дзьмухам!
І тут... распятаму на грудзі села муха.
Там, дзе са смерцю сэрца ў вечнай бойцы.
«Мо гэта цвік?» — сумеліся забойцы.
Цыган спрадвеку слоў не пазычае.
«Ябй-богу, цвік!» — пакляўся я ў адчаі.
І адступілася злачынная навала,
Як лішняга цвіка пашкадавала.
А трыццаць срэбнікаў?
Ляжалі не ў кішэні —
Ва ўлонні злодзеяў
пачварамі кішэлі.

Атручвалі,
тапілі ў багне слізкай,
Гадзюкамі па свеце распаўзліся.
І да каго патрапяць,
той адразу
Пяройме іх прадажную заразу.

Так, я цыган.
Калі спяваю — верце!
Я за яго той цвік прыняў у сэрца.
Бо часам,
нашляваўшы на жывога,
Мы мёртвага ўзносім —
аж да бога!
Таму з надзеяй,
верай
ці журбою
Адвеку я малюся
на жывое:
На дрэвы, травы, сонца...
І на песню —
Як з ёй памру,
то з ёю
і васкрэсну!



У КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ

Дзіця і мадонна...
Глядзяць з палатна,
Дыханнем жыцця сагрэты.
А ззаду пытаюць:
— Якая цана
Карціне маленькай?
Гэтай!

Трывога і жах —
працінаюць наскрозь.
Хто рушыць пяшчотную вусціш?
Даруйце, мадонна!
Прыкідвае хтось
Цану і за нашы душы.

Метал і паперкі —
за праўду і кроў,
За прадзедаў славу
і храмы,
За першае слова
дачок і сыноў,
Яшчэ не народжаных намі.

На што яны будуць —
той фунт ці далар,
Як шалі — на восі зямное?
Прызначце цану —
за планету Зямля,
Гандляр за маёй спіною!



Няма душы?
О — не!
Душу я — маю!
Бо што мне жыць спакойна не дае?
Калі маўчу —
хто голас падае?
Дык вось яна!
Глядзіце ўсе —
вымаю!
...На даланю гляджу...
Пракляты міг!
Яна пустая!
Зрок, скажы —
што маніш!
І раптам чую: «Вочы падымі —
Ты ж свет на далані сваёй трымаеш!»

БАЛАДА ПРА ВІДУШЧЫХ І СЛЯПЫХ

Жыў-быў Цімох. А мо і зараз ён
Яшчэ жывы і гэткі ж зухаваты?
Але тады не дужа малады
І на гады не надта быў багаты.

Ды не гадамі славіўся Цімох
І не раскошай рыжае чупрыны,
Не колькасцю ім пройдзеных дарог,
Не вернасцю не знойдзенай жанчыне.

Хоць жыў нібыта сам ён па сабе,
Не дагаджаў, не джаліў вострым слоўцам,
Ды ў паняверцы, роспачы, журбе
Ішлі з Цімохам раіцца вяскоўцы.

І неяк вось — спытайцеся ў каго,
Вам гэткае ж раскажуць, дый прыхлусяць —
Апанавала хлопца аднаго
Якаясь немач — сам не ведаў, мусіць,

Бо да Цімоха ўвечары прыстаў:
— Вось дай адказ, і ўсё тут, на пытанне! —
І сарамяжна гмыкае ў рукаў —
А можа, немач гэтая — каханне?

Там скроб Цімох патыліцу, як мог,
Ці вус круціў — не ведаю напэўна.
Адно вядома — ноч маўчаў Цімох
І хлопцу так сказаў а першых пеўнях:

— Даўным-даўно жыў мудры Сівагор,
Ён быў мудрэй за вашага Цімоха.

Прыйшоў сляпы аднойчы да яго,
І ў мудраца пытаецца нябога:

«Хоць вас, відушчых, болей, чым сляпых,
Вы — як багі, бо дадзена вам бачыць.
Мы — знаем свет навобмацак, на слых,
Яшчэ на нюх — абвостраны, сабачы.

Ды ўсё-ткі я не скардзіцца прыйшоў —
Мне не даюць спакою вашы скарбы!
Ты здагадаўся, ведаеш ужо!
Хутчэй тлумач мне — што такое фарбы?» —

«Дык слухай,— адказаў яму мудрэц,—
Ёсць чорны колер — ночы і нягоды,
Пачатак свету і яго канец,
Адзіны ён, што бачыш ты заўсёды.

Чырвоны колер мае пах крыві,
Ён — смех вар'ята, смага — ён і боль — ён,
Ён — барацьба... Ды, як ні назаві —
Бунтоўны і гарачы гэты колер.

А белы — смерць і неруш снегавы.
Ён паліць рукі полымем халодным.
Ён — гора пасівелай галавы,
Знямога — абнядоленых, галодных...» —

«Гэй, Сівагор! Сляпы я не душой! —
Разрагатаўся ў твар яму нябога.—
Ваш свет, мудрэц, не багацей за мой!
Я гэткіх фарбаў ведаю — замнога!»

І рушыў прэч. Тут захапіла дык
У Сівагора думкаю балючай:
«Як многа іх — відушчых між сляпых!
Як многа ёсць сляпых сярод відушчых!»

2 Зак. 910

Вось так, сынок...— і замаўчаў Цімох,
Задумаўся і, пэўна, не прыкмеціў,
Як ціха выйшаў хлопец за парог,
Дзе пераходзіў морак у дасвецце.

ДОМА

Злякаліся мроі.
Гады адракліся
Ад дзён і надзей маладых.
І падае,
падае,
падае лісце,
Вятры замятаюць сляды.

Як холадна ў высях!
Як пуста — у далях!
Як цёмна ў бацькоўскім акне!
А цётка,
што мне
свой «дабрыдзень» давала,
Прайшла, не пазнала мяне.

Пакута і сорам.
Ні дома, ні госця.
Нібыта мая тут віна.
І,
глянуўшы ў вочы
сваёй маладосці,
Я плачу.
Смяецца яна.

ПЕРШЫ ПАЦАЛУНАК

Быў снегапад. Не браўся на мароз,
Чамусь здаваўся вечар гэты веснім.
А свет бялеў ад снегу і бяроз,
Што ціха прыпыніліся ля весніц.

Не помніцца, пра што ты гаварыў.
Я не магла знайсці з сабою зладу.
Як свечкі, палымнелі снегіры
На голлі запарошанага саду.

Вісела неба нізка над зямлёй,
Нібы разгледзець твар яе хацела.
І да шчакі спякотнае маёй
Ты дакрануўся вуснамі нясмела.

Цераз імжу даверліва і слепа
У белы свет прарвалася — люблю!..
Быў снегапад. Ціхутка на зямлю
Сыходзіла разгубленае неба.

УСПАМІН ПРА КАРУСЕЛЬ

Там, за лесам, за ракой,
За гарою,
Ёсць старонка, дзе жылі
Мы з табою.

Нас імчала карусель,
Крылы-мроі,
Што там, думалася нам,
За гарою?

Нібы гусі ў вырай-край
Чарадою,
Паляцела карусель
Над зямлёю.

Не з табой сягоння я,
Ты — з другою
За пяшчотаю маёй,
За тугою.

А за лесам, за ракой,
За гарою
Ёсць старонка, дзе жывём
Мы з табою.

АДНАКЛАСНІКАМ


То не вецер іграў,
Націскаючы клавішы лісця,
Не прастора лугоў
Запрашала званкамі на вальс,
І не ў небе зара
Падымала свой ветразь агністы,
А спявала любоў,
Працінаючы гонарам нас.

Звалі нас гарады,
І чыгунка з вакзалам старэнькім,
Захапляючы дых,
Нараджала ў душы неспакой.
Мы не зналі тады —
Тое ўсё,
Што лічылі маленькім,
Раптам вырасце ўміг
Да памеру Радзімы сваёй.

Мы не зналі яшчэ,
Што павек не забудзем той ранак,
Дзе схаваны ў лясах
Наш ціхуткі,
Самотны вакзал,
Што яшчэ апячэ,
Што яшчэ нечакана параніць
І растане ў вачах
На расстанне ў матулі сляза.

Мы прыедзем сюды
Пакланіцца парогу святому.
Усміхнуцца дзяды
Нашым марам і нашай вясне.

Дай вам бог у акне
Бачыць покліч бацькоўскага дому,
Як не ўбачыцца мне,
Як ніколі не ўбачыцца мне.





І чаму ў гэтым свеце расстайным,
Дзе на час нас звядзе далаыя,
У пакуце спазнаныя тайны
Аддаю вам адчайна штодня?

Павяраю, шчырую — навошта?
А ў лістах, што ляжаць пад рукой,
Б'ецца сэрца адкрытаю поштай
У вароты сялібы чужой.

Страшна мне і той страх не разважыць.
Што шукаю? Чакаю чаго?
Б'ецца сэрца — трывожна, адважна
Б'ецца сэрца...
Ці ж спыніш яго?



Зацягне ў вір, звядзе ў гушчар,
У слова — слава ліхадзея!
А я хварэю безнадзейна —
Я веру слову — горкі дар.

Ды як пазнаць яго цану?
Як стаць відушчай, мілы дружа?
Калі сцяблінку палыну
Я з рук тваіх бяру, як ружу.



Навагодняя ноч. Гасне тэлеэкран.
Дагарэлі святочныя свечкі.
І чутно мне, як булькае кроплямі кран,
Злоснік мой бесклапотна-бяспечны.

Вось і ўсё. Прывітанне табе, Новы год!
Прыбяру са стала некранутыя стравы.
Што яго перастрэла? Бяда? Або справы?
Будзь апошнім, сюрпрыз высакосных нягод!

...Не заснуць... Мо прапаўшых без весткі
ў вайну
Гэтаксама чакалі салдаткі?
Слухай, кран, зараз я рукавы падгарну,
Памяняю, нахабнік, пракладкі!

Змоўк стары. Мабыць, зноў адключылі ваду.
Што ж, ляжачых не б'юць. Адступлюся.
Хай жыве. Ну, а я да партрэта пайду,
Павіншую, журбой падзялюся.

— Дзе ты зараз? — чамусьці я шэптам крычу.
Ды не ведаеш слоў, папяровы.
Немудрашчай малітваю вусны хрышчу:
«Будзь здаровы, мой бог адмысловы!»



Знікае, растае ў змярканні твар.
Загавару, а выявіцца — з ценем...
Гартаю дзён нязбытных каляндар,
І холад прабіраецца па целе.

Імкнуцца рукі самі да цябе,
І страшна цішу гэтую парушыць.
Усё слабей твой цень, усё слабей
У цемені пажадлівай і душнай.

І звон крыві палохае мой слых,
Нібыта збан разбіўся на падлозе,
І рукі апускаюцца, як лозы —
Без цен тваіх...



Абрывы грозныя.
Лавіны грозныя.
Нерасцярогай —
Слупы, слупы...
Туманы росныя,
Падманы розныя.
Дымы развееш —
Паўстане пыл.


Няўжо і нашы
Дарогі розняцца?
А лёс не ставіць
Наўсцяж слупы.
Відушчнасць позніцца,
Заўсёды позніцца,
А нараджаецца —
Усё сляпым...



Стань да святла. Прашу я, стань!
Яшчэ адну, адну хвіліну!
Не пакідай, не пакідай,
Дай твар запомніць, мої адзіны.

Ці забыцця, збавення дай,
Над галавой скрані лавіну!
Не пакідай, не пакідай
Жыцця майго напалавіну.

А ты маўчыш. Апошні дар —
Маю далонь сціскаеш з хрустам...
І запякаецца на вуснах:
Не пакідай, не пакідай...





Ад воч маіх, ад рук —
Пяшчоты цераз край.
Ну як жа так — «даруй»?
Як можна так — «бывай»?

А як жа я — адна
І ночы ўсе, і дні?
...Святло не мае дна,
А цемра — вышыні.

Ірву траву-разрыў
На ростанях надзей...
Ты паліто забыў!
Ты... паліто надзень.



— Адпусці! —
Разанула, як нож.
Мо таму,
адурэўшы ад болю,
я ў зімовую ноч
басанож
уварвалася ўслед за табою.

Уварвалася.
Толькі на міг,
той,
што выхапіў свет бліскавіцай,
каб спасцігла
ля ног тваіх —
вышыня не бліжэе ніцма.

Адпусціла.
Ідзі.
Не трывож.
Хай застыне жывіца на зрэзе.
...Кожнай ноччу
бягу басанож
за каханнем сваім
па снезе...



Ты не са мной. Пагашана святло
Ў жытле маіх нясмелых летуценняў.
Я ўспамінаю тое, што было,
Як бездань, у якую не зляцелі,
Як вышыню, куды мы не ўзышлі...





Абыду, адыду, саступлю,
Ані ўсмешкай, ні словам не змушу.
Не падумай яшчэ, што люблю!
Проста горача стане і душна.

Проста сэрца заб'ецца хутчэй,
Неўспадзеў разрываючы цішу.
Не падумай, канечне, яшчэ,
Што нібыта цябе ненавіджу!

Не вініць мне цябе, не забыць,
Не звязаць абарваныя ніці.
Проста моц ты адняў, каб любіць.
І бяссілля не даў — ненавідзець.

СУСТРЭЧА

Не мароз у твар,
А ў душу, як вар.
І не ў цішы гром —
Нібы ў слуп ілбом,
Што грудзьмі на нож —
І зямля з-пад ног.
Пахіснуліся.
...Размінуліся...




Гуляе непагадзь.
Мой горад у аблозе.
О, рэчаіснасць! —
Прывідная небыль.
Гуляе непагадзь
на роспачным парозе,
і бровы-хмары
ссунуты ў пагрозе,
маланкай пашчу
разяўляе неба.
Гуляе непагадзь.
Ну што ж!
І я ахвоча!
Кранем з вятрыскам
струны дажджавыя!
А пустабрэх-пярун
ужо ракоча,
нібыта за спіной маёй
рагоча,
а струны адгукаюцца —
жывыя!
Ім падпявае
дыскант ручая,
басамі —
вадасцёкавыя трубы.
Вачамі ў вочы —
непагадзь і я
за крок ад прасвятлення
і ад згубы.



Чалавечае ўсё
пачынаецца —
з дабрыні,
разумення,
даверу.
Толькі часам душа
зачыняецца —
нібы ў хаце пакінутай
дзверы.
Ад зласліўцаў-зламыснікаў
тоімся,
самі робімся мы
калючымі.
Замыкаемся,
непакоімся,
а пацэляць —
па самым балючым...

ЗГАДКА

Божа, з якіх хмар —
Б'е бліскавіца мар!
Божа, ў які дуб —
Б'е бліскавіца дум!



НА ДВАІХ

Любашы

Калі ад крыўды ломіць косці,
Хаос у думках, зло ў вачах,
Сваю сяброўку клічу ў госці
Без розных слёзных «вох!» ды «ах!».

Імкнуся быць я гаваркою,
Бяспечна байкі баю ёй,
Ды зразумее — штосьць такое
Ўсё ж адбываецца са мной.

На жарт усмешкаю адкажа,
Трывогу ў сэрцы несучы,
І ўжо лягчэй мая паклажа,
Злятаюць крыўды крумкачы.

Знікае жар несамавіты,
І я выношу без прыкрас
На суд яе, нібы Феміды:
Хто праўду меў на гэты раз?

Яна, і сапраўды, рассудзіць,
Дзе пашкадуе, а дзе — не.
Нібыта ў сне благім разбудзіць
І прыме боль мой за мяне.

Ды знаю ўсё ж — як толькі ўдача
Мой крок адзначыць, зойме дых,
Раздзелім радасць не іначай —
Таксама роўна на дваіх.



Жэні Купрыяновіч

Цяпло на зломе, восень залатая
Ужо стаіць на жнівеньскай мяжы.
Як мы знячэўку ў сталасць залятаем!
А дзе яна? У чым яна, скажы?

Захопіць дых ад даўкае трывогі,
І выклікам бядзе пад халады,
Не зважыўшы на ўсе перасцярогі,
Цвітуць безабаронныя сады.

Адвага безагляднага цвіцення —
Хаця б на міг, вось так, ад лішку сіл
Паверыць у сваё пладанашэнне,
Атаваю падняцца з-пад касы.

Пульсуй, рымстуй, даверлівасці жылка—
Зярнятка між калючага асця!
Трымаюць свет узнёслыя памылкі,
Якіх шчаслівa многа — у жыцця.

ПАЦЕРЧЫНА ЗАМОВА

Пацеркі шкляныя,
Кроплі каляровыя!
Падфарбую губы я,
Падвяду і бровы я.

Падміргну люстэрку:
Ці то не красуня?
Дык няхай жа злодзейка
Прада мной спасуе.

Хай вачам зайздросным,
Да чужога квапным,
Модныя абцасы
Будуць стрэлам трапным!

Здрадліваму любаму
Даравацъ дарэчна:
Як за жонку возьме,
Помста будзе вечнай!

БАБІНА ЛЕТА

— Скажы, вачэй не тоячы,
Душа другою зваблена,
Тут не прайшла надоечы
Жанчына — Лета Бабіна?
Такая, меднакосая?
Сукенка-павуцінка,
Асыпаная росамі?
Я знаў яе дзяўчынкай.
І цеплынёй сардэчнаю
Дарэмна быў сагрэты.
Здавалася мне вечнаю,
І раптам знікла Лета.
Па закуточках восені
Шукаю несуцешна,
Пайду слядамі роснымі
І размінуся сцежкай.
У цеплыні ласкавае
І зараз я ў палоне.
— Не бачыла,— адказвае
Жанчына ў капюшоне.
Пайшла далей сцяжынкаю,
Згубілася між вербаў.
Апошняю дажджынкаю
Зямлю кранула неба.
І плашч пад вербалозамі
Злятае ціха ў травы.
Пайшла меднавалосая
З усмешкаю гаркавай.

БАЛАДА ПРА ДВА МАЎЧАННІ

Аднойчы там, дзе так патрэбна слова,
Сустрэліся маўчанне і маўчанне,
Сустрэліся дзве колішнія крыўды
За крок адзін ад пільнае бяды.

І глянула маўчанне на маўчанне
Так непрыветна, пуста, адзічэла,
Што бездань расхінулася між імі
І ўсталі строма скалы за спіной.

Жахнуліся маўчанне і маўчанне,
Убачыўшы канец сваёй дарогі,
Нямыя вусны сцяліся, і слова
Пакутліва шукалі языкі.

Урэшце дух знямог і засталося —
Не разам жыць, загінуць толькі разам.
І рукі пацягнуліся насустрач,
І слова нарадзілася: «Даруй!»

З СЫНАМ У ПАРКУ

Адваявала восеньская рацъ.
Не навіна — марозны, золкі ранак.
Растрачаную сілу не сабраць.
Кляновы ліст ірдзіцца, нібы рана.

Не заўважаючы, старэем пакрысе,
Здаём і мы пазіцыі з баямі,
Але расце, мужнее поруч з намі
Надзея, што вясну ў сабе нясе.

І вачаняты, нібы дзве зарнічкі,
Раздзьмухваюць пяшчоты вугалёк.
Ты недзе зноў «пасеяў» рукавічкі,
Давай сагрэю рукі, мой сынок.

СКРЫПАЧ

З-пад броў сівых, рухавых і густых
Зірнулі вочы — сінія раней:
— Як не цяпер, то ўсё-ткі праз гады,
Прашу вас, напішыце пра мяне.

Ну проста так, што жыў адзін скрыпач
І ўсё жыццё нязбытнага шукаў.
Ён скрыпцы загадаў аднойчы: «Плач!»
А скрыпка — рассмяялася ў руках.

Калі б змаглі адчуць вы, зразумець
Тугу па смыку! Так во — з усіх жыл!
Не слухаецца скрыпка — гэта смерць!
Я не жывы, вы чуеце, я — жыў...

Ну, дайце выпіць, што там у вас ёсць?
І не ўшчувайце... Чуеце мяне?
Вы знаеце, маё прызванне — госць.
А дома што? — Абцасам па спіне.

Не жарт. Было. Аднойчы і даўно.
Балюча, знаеце. Аж цемень у вачах.
Я дараваў. Цяпер мне ўсё адно.

...Дрыжалі нема рукі ў скрыпача...

РАНАК МАСТАКА

І поле — не поле —
Зіхоткі блакіт,
Ружовыя іскры,
Рухавая бель,
А ў небе — агністы,
Агромністы кіт
Ці ветразь пунсовы
Нясе карабель.
Ліловыя цені
Бягуць у лагі,
У зараслі вербаў,
У схованьмастка.
Мяняюцца фарбы,
Ільсняцца снягі,
А пэндзаль замёр
У руцэ мастака.



СПОВЕДЗЬ СНЯГУРКІ

Вясновы золак — горка-маладых,
Агонь ахвярны, боль і панацэя,
Маё збавенне, згуба і надзея,
Усё, што ёсць на свеце — гэта ты.

Усё, што ёсць, што будзе і было,
Адкрыта мне ў імгненні гэтым юным.
Ды час прабіў — даверлівыя струны
Кранула асцярожліва святло.

Запаліць сонца промнем раўчукі,
І я ўліюся з імі ў гэты ранак.
Не адыдзі, адлегласць гэтак раніць,
Не адпусці гарачае рукі.

Я заміраю ў слодычнай журбе,
Бывай! Адно скажу я на расстанне:
Не думай, што ад сонца я растала —
Я проста растварылася ў табе...

КРАСАВІЦКАЯ ДАРОГА

У кронах месяц птушкаю лунае,
Дарога ўзлескам вывела на Друць.
Зашэрхлы снег, як завадзь люстраная,
Дзе дрэвы задуменныя плывуць.

Мароз мацнее. Заінелі веі.
Няўжо адліга руціла дарма?
Здавалася, не вернуцца завеі,
Здавалася, і вось табе — зіма.

Зноў па начах набегі паўтарае,
Счарнелы твар парошаю мазне.
Навошта фанабэрыцца старая?
А мо і ёй не спіцца па вясне?



Усмешкай растрывожана —
гордай, светлаю.
Стаю на раздарожжы.
Якім?
Не ведаю.

Сцяжынку не пазначылі
сляды расстайныя.
А я стаю,
удзячнаю
душой
світаю.





Скрыжоўвалі мы позіркі не раз
На вуліцы, у сквэрыку, музеі.
Надзей не вышыналі напаказ,
Услед адно другому не глядзелі.

Так і прайшлі па сонечнаму лету.
Даруе лета, помню толькі Вас.
Снягі сплывуць, адновяцца палеткі...
Хто Вы такі? Мне не адкажа час.

Ды вобраз ваш нібыта скрозь вякі
Праб'ецца невыразна і растане.
І не падаць насустрач Вам рукі,
Рукі не дакрануцца на расстанне.



Скончыўся дзень.
Прэч вясёлую маску.
Дзякуй,
Што ёсць ты на свеце,
Работа!
Ды хочацца крыкнуць
Праз боль адзіноты:
Не прамініце сцяжыну ў казку!
Не замуруйце сваю пяшчоту!
Не пакідайце на потым ласку!
Не пакідайце любоў на потым!



Гэта ты, а не вецер прарваўся ў акно,
Адхінаеш рашуча фіранку...
Ёсць у нас толькі ноч, толькі стромая ноч —
Летуценніца-мроя да ранку.

Развідняе. І страшна падумаць, павер,
Як рассыплецца зорная цемень
З вадаспадамі рук, з ціхім плёскатам вей
На чужыя, рахманыя цені.

За якою віной, за якою сцяной
Ты хаваешся з даўняга лета?
...Летуценніца-ноч пазірае ў акно
З-за фіранкі — раскрыленай ветрам.

ПРЫТЧА ПРА КВЕТКУ

Я кактус калючы вясной пасадзіла
ў зялёны гаршчэчак.
Я пальцы калола,
яго даглядала,
яго ашчаджала,
каб кветкай, як казкай,
дзівоснаю казкай,
ён выбухнуў ноччу,
адзінаю ноччу,
якой зацвітае калючы мой кактус.
Адзінаю ноччу,
бо раніцай кветка пажухне,
завяне,
нібыта баіцца душой сваёй кактус
адкрыцца чужому, цікаўнаму воку.
Я ночы не спала,
пільнуючы кветку —
навошта ж тады укладзе сваю сілу
мой кактус маленькі ў магутную кветку?
Навошта душа яго ночы халоднай?
І што прыгажосць яго цёмнае ночы?
Ды ноччу адною была я ў дарозе,
спяшала дадому зірнуць на свой кактус,
і кветкай апалай, што долу ляжала,
паніклаю,
мёртваю,
бледнаю кветкай
сустрэў мяне ўранні засмучаны кактус...
...Як часта любімыя, дзіўныя нашы,
адзіныя нашы — без нас адцвітаюць...

СЕЗАМ

Выйду ў спёку, у сцюжу, насустрач вятрам,
Шлях знайду цераз далі і высі.
Адчыніся пячорай у казку, Сезам,
Адчыніся, Сезам, адчыніся!

За багацце тваё без развагі аддам,
Прысвячу табе ночы і дні ўсе.
Скарбаў толькі тваіх я жадаю, Сезам,
Адчыніся, Сезам, адчыніся!

Не даверся, прашу я, чужым галасам,
Што мой покліч пяроймуць наўмысна.
Адчыніся, Сезам, адчыніся, Сезам —
Сэрца любага мне, адчыніся!



ВЕЧАР

Не назаву свой вечар адзінотай,
Няхай не знала поціску рукі —
Прыйшлі трывога, мара і пяшчота,
Каб падарыць імклівыя радкі.

Хай у дарозе весцейка ад мамы,
Але надзеяй вечар прамянеў.
Яшчэ, сябры, я поўнілася вамі,
І, можа, вы згадалі пра мяне.

Мне чуўся смех ваш, помніўся ваш клопат.
Хіба ж была сягоння я адна?
Вунь месяц вокам вогненным цыклопа
Цікуе на святло майго акна.

Не можа, пэўна, сцяміць — што за свята,
Які пануе ў хаце неспакой?
І цягне носам пах мае гарбаты —
Хіба ж заварыш гэтак для адной?

Ды што хітрыць з сабою мне і з вамі? —
Вагу і моц найлепшага радка
Я аддала б за гутарку з сябрамі,
За слоўца, хоць адзінае, ад мамы,
За спеў дзвярнога, простага званка.

* * *

Рука ў руцэ
Праменьчыкам бялела.
І на мяжы —
У смерці і жыцця —
Спачатку «Вы»,
А потым «Ты» —
Збалела
Я выдыхнула слова з небыцця.

О, горыч забароненае высі!
Нам цэлы міг адкроіў
Шчодры час.
«Даруйце! —
Я сказала.—
Не вініце!» —
«Прабачце мне,—
Пачула я ў адказ,—

Што з Вамі размінуўся я —
Вякамі...»
Хіснуліся пад зоркамі дамы.
І хто б услед ужо
Ні кінуў камень —
Ён будзе не цяжэй,
Чым неслі мы.

МОЙ РАЗЛІК

Павек разлічваць буду —
Бо як мне жыць іначай?
Разлічваю на цуд я,
Разлічваю на ўдачу.

Разлічваю на поўню,
Калі на небе ветах,
На адраджэнне пожні
І неўміручасць кветак,

На далі і на высі,
На добрыя сустрэчы,
На крыўды ненаўмыснасць,
На розум чалавечы,

На вернасць у каханні,
На шчырасць у сяброўстве,
Калі і хтось абманіць —
Разлічваю ўсё роўна!

БЫВАЙ, ЗІМА!

Дзьміце шчыра, дудары!
Грайце дружна, гусляры!
На праводзінах зімы —
Каб жылося і маглося,
Каб радзіла і вялося —
Грымнем песню мы!

Што надзьмуўся, барабан,
Нібы той вяльможны пан?
На марозе скамянеў?
Ну-тка ўсыпце барабану
Як належыць і па сану —
Сто «гарачых» па спіне.

Бомы! Бомы загучалі!
Коні! Коні праімчалі:
— Сцеражыся ў мітусні! —
Хлопчык енчыць, просіць маці:
— Пакатацца! Пакатацца
На кані-кані!

Падбівае дзядзька:
— Сват!
Хоць кажух бяры ў заклад —
Самы дужы — я!
Што ты кажаш? Маеш свой?
Ну тады і бог з табой!
Праўда ўсё ж — мая!

Коцяць снежныя камы,
Ладзяць снежныя дамы.
Ком на ком — гатовы дом!
Ком на ком — і снегавік!

Завіхаюцца кругом,
На шчацэ язык.

Вось і снежкі ўслед ляцяць!
«Бой» прымаць? Ці — уцякаць?
Хто даўмеецца?
Зазяваўся, вер не вер —
Будзе снежка за каўнер!
Што тут дзеецца!

Як і тут не падзівіцца —
Ох, і скача маладзіца!
Гарманіст, не адставай!
Рукі ў бокі, ногі ў скокі
Самі мкнуць за яснавокай.
Ну, давай, давай!

Самавар бухціць і квохча.
Цётка кліча:
— Хто ахвочы?
Чай гарачы! Смачны чай!
Як без грошай — пазычай!
А дзяўчыну маладую
Я і дарма пачастую!

Бач, галоўку апусціла!
А ці другам, а ці мілым
Не прывечана?
Перакінь віту касу,
Пакажы сваю красу
Хлопцу, дзеўчына!

Дзед крычыць:
— Чаго стаіш?!
Так апошні блін праспіш!
Налятай жа, братка!

Налятай хутчэй на блін,
Надта ж смачны, чортаў сын,
Не да ночы згадка!

І цячэ, ну як на грэх,
Пад дзявочы звонкі смех
Па бародах масліца!
Тут араб, мангол, француз,
Афрыканец і індус!
Віват, масленіца!

ВЯСНОВЫ МАТЫЎ

Нібы коцікі ды вербы —
На душы — гармонія.
Раздзімай, дыханне, рэбры,
Як мяхі гармоніка!

Не журыся, свет-бяроза!
Сумаваць — нягожа нам.
Прыбірай, красуня, косы,
Лісцем упрыгожвай.

Мо на зайздрасці, сястрычка,
Гэты сум замешаны? —
Ах, якія завушнічкі
Побач у алешыны!





Сястры Жэні

Ты чуеш, сяструха,—
вясна і мірна!
І нам жывецца
няблага ўвогуле!
А мы дзелавыя такія
і смірныя,
нібы ад ношы вялікай
знямоглыя.

Мочым боцікі
ў талых лужынах,
нам бы разбегчыся і...
Спадніца!
Яна, канечне,
па модзе завужана —
як бы ў палёце
не бразнуцца ніцма.

Што ж нам у хаце з табой
не сядзелася?
Крочым па вуліцы
важныя, гордыя...
Слухай, сяструха,
табе не хацелася б —
колам прайсціся
па вуліцах горада?

Колам, як помніш,
па лузе ранічкай?
Каб палымнела душа,
як шчокі,
каб нехта ўслед

языком пашчоўкаў,
нібы салоўка,
што кліча абраную.

Бачу — ў вачах тваіх
скачуць чорцікі.
Прайшлася б, знаю,
калі б не знаёмыя.
А як жа! —
Вясна — маладая, няўёмная!
З самотнай вярбы —
усміхаюцца коцікі.

ДЗЯЎЧО І РАЎЧУК

Дзеўчаня малое
Сцежкай прыскакала.
— Гэта што ж такое? —
Раўчука спытала.—
Дзе старая кладка?
Зноў паводка змыла?
Што рабіць мне, братка?
Што рабіць мне, мілы?
  Прамяні-струмені
  Кпінамі казычуць:
  — Можа, глузду меней?
  Або ног пазычыць?
  Ну, смялей, дурніца,
  Да мяне наблізься.
  Падаткні спадніцу,
  Як змачыць баішся.
Штось дзяўчо міжволі
Хустачку камечыць:
«Ай, раўчук-свавольнік!
Вось куды ён меціць! —
І глядзіць з дакорам.—
Як жа пагадніцца?
Маці кажа — сорам
Задзіраць спадніцу».
  — Мо ты крываногa,
  Ягадка-дзяўчына?
  Вось яна, нябога,
  Сціпласці прычына!
— Ах ты, брэх сабачы!
Ссохлае карыта!
Я табе аддзячу —
Атрымай за крыўду! —
І дзяўчо ад злосці

Пырскі падымае
І, як можа, помсціць,
Раўчука даймае.
        А раўчук таропкі
        Ножкі абдымае,
        Самацветы-кроплі
        У падол кідае.
        І такі рахманы,
        І такі лагодны:
        — Не шукай падману.
        Пасябруем! Згодна?
«Мо наказ той лішні?
Іх зашмат, няйначай!» —
З раўчуком увішным
Як праменьчык скача.

ПАВОДКА

Аб'ядналіся ў паводцы
Дол і вышыня.
У нікуды плыць на лодцы
Хораша — вясна!

З беражкоў глядзяць пралескі
І заспаны сон,
Пералескі-перабляскі —
Музыка лясоў.

Свет зіхоткі, свет вясновы,
Нібы новы дом.
З першым выпасам, каровы!
Гэй, гракі,— з гняздом!

Пах трывожны, дух салодкі
І святло — без дна.
У нікуды плыць на лодцы
Хораша — вясна!

БЭЗ

Бэз! Бэз! Бэз!
Ах ты, стары знаёмы!
Пах, шэпт — ўвесь
Мроя далёкага дома.

Бэз! Бэз! Бэз!
Мчацца на хвалі светлай
Плёс, луг, лес,
Юнае даўняе лета.

Бэз! Бэз! Бэз!
Тварам тану ў суквеццях.
Сінь, высь — спрэс
Звонам паўнюткі вецер.

Бэз! Бэз! Бэз!
Хлынуў шчаслівай стомай!
Плёс, луг, лес —
Мроя далёкага дома.



Прабіўся з цеснага жытла,
Зірнуў расток — паўсюды глеба.
Ды шлях знаходзіць да святла.
Адкуль ён ведае, дзе неба?

Над хлебам руніць з веку ў век
І поруч з клопатам аб хлебе
Імкнецца ў неба чалавек.
Дык што ж такое там — у небе?

Расліны, людзі і звяры,
Пакуль не прыме вечны цэрбер,
Стаім нагамі — на зямлі,
А галавой жывём — у небе.

ДЭЛЬТАПЛАНЕРЫСТЫ

Разбег, штуршок,
Хіснуцца купы вербаў.
Так ветру ў твар
Над плынню дзён і рэк
З пустыні Наска,
З плато Усцюрт у неба
Да зор спрадвеку
Выходзіў чалавек.


Чакайце нас,
Каханыя,— нам нельга
Дазволіць страху
Крыло абвіць плюшчом.
Не плачце ўслед,
Праводзячы — у неба,
Вы верце — неба
Падставіць нам плячо.



О, не пытай дарэмна, не суроч
Нясмелай згадкай ісціны дыханне,
Я адкажу, хаваючы прызнанне:
«Быў дзень як дзень.
І ноч была як ноч».
Дрыготкіх вей яшчэ адзін узмах —
І голас мой зламаецца ад тайны,
Якая так зняверана, адчайна
Ахвярнай свечкай выблісне ў вачах.
А колы вёрсты злічаць, як казну,
І прызначэннем — станцыя расстання,
Дзе застануцца ў зале пачакання
Наш дзень і ноч з дарогай у вясну.



— Чакай, не трэба, не кажы!
Я здагадалася, павер мне.
Другой прызнанне зберажы —
Адной. Што моўлена — не вернеш.
І не пярэч мне, не спяшы.
Калісь, амаль што па-дзіцячы,
Крышталі звонкія душы
Я падарыла без астачы.
Таму, хто іх прыняў тады,
Была ў цяжар мая адкрытасць.
Ляжаць за памяццю гады —
Крышталь скалечаны, разбіты.
Ну як тут вытрываць і зноў
Расціць даверлівасці друзы?..
Чаму ты позірк не адвёў?
— Я памагу табе. Я дужы.





Мора дыбіцца.
Вецер з гор.
У сусвеце, як ворыва чорным,
Заступілі ў начны дазор,
Ціха ў небе ступаюць зоры.

Як агонь з-пад мяхоў каваля,
На ўзбярэжжы маяк аслепіць.
Рукі гор прасцірае ў неба,
Абдымае сусвет Зямля.



А мы не запомнілі назвы гары,
Не ў назве шукалі прынады.
Нясцерпна даймалі ўначы камары,
Звінелі ўрачыста цыкады.

І пахла сухой і гарачай травой
Чамусьці салодка і горка.
Ўсміхнулася мне над тваёй галавой
Дрыготкая першая зорка.

У прыцемках той найсвятлейшай пары
На варце шчаслівае долі
Маўкліва і строга паблізу гары
Цягнуліся ў неба таполі.

А там, на вяршыні гары, неўпрыкмет,
Амаль са святою пашанай,
Як мудрасць вякоў — мы ўбіралі сусвет.
О, як мы тады не спяшалі!

І мы не запомнілі назвы гары,
Не знаем імя тае зоркі,
Што ў нас і па сёння шчымліва гарыць
З тым водарам слодычна-горкім.



Ноч надышла не проста зменай дня,
Вяшчунка-ноч надарылася шчодрай —
Нам адчыніла скарбніцу без дна,
Дзе мы ўзялі каханне і пяшчоту.
А потым ранак хваляю святла
Нясмела ў шкло пастукаў, як староннi,
Нібыта ў дом прасіўся да цяпла
Сагрэць свае азяблыя далоні.



Восень, восень,
рыжая ліса.
Плоццю выспелаю —
бабінае лета.
Сівізной блішчыць мая каса.
Рвецца песня тая,
што не спета.
К горлу песня тая,
што была,
як віно —
нявольніцай гадамі.
Я віна такога не піла.
Мы такога хмелю не згадалі.
Крок насустрач
цераз плойму бед.
Павярнуся тварам пабялелым.
Зашчыміць
у сэрцы адбалелым
пяршацвет,
вясновы пяршацвет...



Падатлівая? Цвёрдая?
Ласкавая? Ці гордая?
З табой сябе шукаю:
Якая ж я, якая?

То з крыўдай, то з пяшчотаю,
То трызню адзінотаю.
Няма ні ў чым спакою.
Ды што са мной такое?

Лавінай думкі коцяцца.
А ты і не маркоцішся,
Шукаючы прычыну,
Махнуў рукой — жанчына!



Паміж намі сумненняў роздымы,
Паміж намі ялінамі вострымі
Нашы звычкі, што сталі коснымі,
І сляды, як шматлікія кропкі,
Жыццяў двух, што ішлі паасобку
Да сустрэч і да нашых ростаняў.

Нам нялёгка парою быць шчырымі,
Кроім спрэчкі падчас беспрычынныя,
Вывучаем з табой без спачыну мы,
Як прышэльцаў з другой планеты,
Ты — жанчыну, а я — мужчыну,
Я — паўсвету, і ты — паўсвету.

ВУЧУСЯ РАЎНАВАЗЕ

Прачнуліся на сонцы капяжы,
Адвечныя вясновыя прарокі.
Няхай яшчэ няўпэўненыя крокі,
Але ты чуеш? Чуеш? Адкажы!

Вунь дворнік лёд бязлітасна дзяўбе,
Нібыта век чакаў такое працы...
...Ні шэптам і ні крыкам не прабрацца —
Снягі маўчання леглі да цябе.

Я знаю, вінавата прад табой
За рэўнасць і нянавісць да спакою.
Табе нялёгка, ведаю, са мною,
А лёгка мне, ты думаеш, самой?

Усё здаецца — нешта праміну,
Усё здаецца — нешта не спасцігну,
Ці штось недакранальнае крану,
Ці неруш апляце, як павуціна.

Але хвалюе большае парой —
Утульнасці пачуцці падняволіць,
І засмяяцца ў міг чужога болю,
І затужыць ад радасці чужой.

Спакой, як пыл, кладзецца на душу,
І не сцярпець мне гэты непарадак.
Не трэба мне ні лекі, ні парады,
Калі злую, смяюся ці тужу.

Дае мне раўнавага свой урок.
Як мне гайданку, вецер не прывеціць?
Не ўшанаваць выбоіны дарог? —
Дзе гладка, там і коўзка ў гэтым свеце.



Не вымярай маёй віны
Якім часовым вымярэннем.
Як цяжка вырваць палыны,
Што прараслі ў душу карэннем!

Ці можна даравацъ віну,
Як ветранасць даруюць ветру?
Ты падары мне лепей веру —
Яе павек не абміну.



Поўнюся сонечным зайчыкам шчасця —
Чуць цябе, бачыць.
Чаму ты ў журбе?
Хочаш —
выратую ад напасці?
Толькі скажы,
што зрабіць для цябе?
Хочаш —
казку падару,
самую светлую?
Хочаш —
у месяца рог пратрублю на зары?
Хочаш —
зраблюся незвычайна ветлаю,
Што нават выслухаю анекдот стары?
Хочаш —
свой сонечны зайчык я рассялю
У асколкі люстэрка
Снежнай Каралевы?
Хочаш —
вячэру не перасалю?
Хочаш —
лодкі на рацэ ператвару
ў каравелы?
Я ўсемагутная побач з табой!
Хочаш —
разальюся ў пустыні вадой?
Хочаш —
я стану нават
святой?..
— Не трэба!
Застанься сабой!



Падчас самоты
Альбо тугі
Прымружу веі —
І свет другі.

Прымружу веі —
Няма слаты
І на галінках пустых —
Лісты.

Калі ж з табою —
Няма пільней.
Ты мружыш веі —
І страшна мне.



За лясною прысадай
Дзень жыцця дагарыць.
Я ля ног тваіх сяду,
Гавары, гавары,
На руках, як малую,
Паднімі дагары.
Я цябе замілую,
Гавары, гавары,
Адчуванне спакою
Хоць на міг падары,
Як мне люба з табою,
Гавары, гавары...

ЛЕТА-МЕДУНІЦА

Лета маё, лета,
Лета-медуніца!
Ціха млеюць зёлкі
Ў сонца на вачах,
Ад зямлі прагрэтай
Марыва бруіцца,
Бацяны танцуюць
Вальс на паплавах.

Лета маё, лета,
Лета-медуніца!
Голасам жалейкі
Поўніцца прастор.
Як дзяўчо-падлетак,
Бавіцца крыніца —
З промнямі гуляе
Стужкай залатой.

Лета маё, лета,
Лета-медуніца!
Ад спякоты коні
Забрылі ў ваду.
А за сінім лесам
Спее навальніца,
Радасна грукоча:
— Уцякай! Іду!

ГАРАДСКАЯ БЯРОЗА

У голас горада грымотны,
Яго няўседлівы імпэт
Бяроза вусцішна, пяшчотна
Ўплятае свой зялёны шэпт.

Вядзе гаворку з промнем, ветрам,
Перабівае гоман, гуд.
Стаіць узбоч ля парапету.
Аб чым, лясунка, дбаеш тут?

Ці падалася ў горад госцяй?
Ці — вызнаць моц свайго святла?
Ці ад саперніц прыгажосці
Сваёй някідкай уцякла?



Хто хоць аднойчы адолеў вяршыню,
Той вечны палоннік гор.

Хто хоць аднойчы прымерыў крылы Ікара,
Той вечны палоннік неба.

Хто хоць аднойчы перамог стыхію хваль,
Той вечны палоннік мора.

Ты кажаш — я пакарыла тваё сэрца.
Няўжо я твая паланянка?

КАСЦЯНІЦЫ

Басанож па імхах, па ігліцы —
Не знікай гэты прыхамаць-шал!
Заірдзяцца ў лясах касцяніцы,
Замірае наросхліст душа.


Замірае. І як не спыніцца,
Расхінуўшы галінак вязьмо?
Усміхаюцца мне касцяніцы,
Усміхаецца лета само.

Тварам долу прыпасці, забыцца,
Патануць у густых верасах...
Ах, як горда нясу касцяніцы —
Гронку сонейка ў валасах!



Яшчэ не зусім адбуянiла лета,
Яшчэ верасы не цвілі ў пералесках,
А восень ірве павуцін арабескі,
Чацвёрку вятроў запрагае ў карэту.

Чаканнем напоўнены дол і паветра,
Трывожыцца пушчам, сумуецца гоням.
— Куды вы рвяцеся, крылатыя коні?
— На ўсе бакі свету...
На ўсе бакі свету...



Поўніць істоту
незразумелая туга,
калі глядзіш
на восеньскі пейзаж.
Мабыць, ёсць у нас
нешта ад птушак,
якія перад адлётам у вырай,
магчыма, у апошні раз
акідваюць позіркам
родныя мясціны.
Можа, у восеньскай тузе
пагалоскі настальгіі?
Добра, што мы не птушкі
і можам на роднай зямлі
сустракаць свае вёсны.

ЦЕСЛЯ

Можа, гэтай восенню,
Мо другой
Развіднее просінню
Залатой.

Ці на гэтай сцежачцы,
Ці на той
Прыкушу з усмешачкай
Завіток.

Нагадаю весела
Ці з журбой,
Як сядала з цеслем я
Пад вярбой.

Як была багатаю
Той парой —
Будаваў ён хату мне
Пад вярбой.

Ладзіў сцены з мораку —
Абдымаў.
Зацяпліўшы зорачку —
Цалаваў.

Ды была багатаю
Да пары.
Знікла мая хатачка
На зары.

Не рыпелі веснічкі,
Як пайшла —

Хай гадае цеслячку:
Ці была?

А на роснай сцежачцы
Скрозь — сляды.
Думай, думай, цеслячку
Малады.

СОНЕЙКА Ў РОСАХ

За дубровай пыхціць паравоз.
Луг — калючы ад свежых пракосаў.
Свет, сатканы са смеху і слёз —
Свет дзяцінства — як сонейка ў росах.

Пругкі вецер падставіць крыло,
Растрывожыць, пакліча ў дарогу.
Божа, колькі дарог тых было,
Што ляжалі тады ад парога!

Нам здавалася — нашыя ўсе!
Нам здавалася нават — іх мала!
І цішком, каб не бачылі — ўслед
На дарогу хрысціла нас мама.

І цяпер, у гадоў на зыры,
Мы ўсё болей адвечнае цэнім.
Свет — акно ад зары да зары —
Ззяе маміным тым блаславеннем.

* * *

Што чысцей, чым крыніца, паветра і снег?
— Любоў маці.
Што нам свеціць за сонца і месяц ясней?
— Любоў маці.
Што сагрэе без вопраткі, ежы, агню?
— Любоў маці.
Што не знае ні страху, ні стомы, ні сну?
— Любоў маці.
Што за птушак вышэй у нябёсы ляціць?
— Любоў маці.
Што даецца нам дарма ў жыцці?
— Любоў маці.

АРЭЛІ

Мільгала здагадка,
Аж вочы гарэлі:
Майструе нам татка
Арэлі, арэлі!

Як гушкалі строма,
Як спеўна рыпелі,
Не знаючы стомы,
Арэлі, арэлі!

Трухлела вяроўка,
Мы долу ляцелі,
Ды клікалі зноўку
Арэлі, арэлі!

Адвагі шаленства —
Узяць мы хацелі
Вышыні маленства —
Арэлі, арэлі!

Падзенні, узлёты,
Мурашкі па целе...
Жыццё маё, што ты?
— Арэлі, арэлі!

ПОЛАЦКАЯ САФІЯ

Амаль не ламаюць
Танюткія шыі,
Дзяўчынкі-гарэзы
Глядзяць на Сафію.

З-пад стрэшак зрываюцца
Ластавак цені.
Ляцяць у нябёсы
Бялюткія сцены.

Памкнуцца б за імі
У сінія высі,
Ды цягне ў глыбіні
Камень Барыса.

Тут кронамі дрэваў
Шапочуць паданні
І мрояцца вояў
Трывожныя здані.

Куды ж вы, дзяўчынкі,
Танюткія шыі?!
...Чародкай лябёдак
Ляцяць над Сафіяй...

СЫНУ

Не глядзі,
што скажуць за спіной —
меркаванняў столькі ж,
як сумненняў.
Пільным будзь
да ўласнага сумлення,
каб не захінулася
маной.



Як толькі зоймецца паўкруг,
Зары паўкруг,
Пусці наўскач каня, мой друг,
Спяшы, мой друг!

І, покуль спяць яшчэ лугі,
Вятры ў лісці,
У дзень другі, як век другі,
Каня пусці.

Сталі дых календары —
Яшчэ скачок!
Ты на краі Зямлі — зары
Падстаў плячо!

ПРАВА ВЫБАРУ

Грымнуў час: «Пачынай пераправу!
Нас на моц вывярае выток.
За жыццё, дарагі, не за славу —
Пачынай пераправу, браток!

Налягай, налягай на вясло!
Не губляй ні хвіліны, ні мігу.
У вачах асцярожнасці — тло.
У вачах палахлівасці — ліха».

І такая пайшла пераправа! —
Лёс рулюе, сумленне грабе.
Права выбару — жорсткае права:
Выбіраем не штосьці — сябе!



Аддайце чалавеку чалавечае,
а машыне — машыннае.
Роберт Вінер

Хоць мноства дум
адпрэчыў тлум
пустога і сквапнага побыту,
але нясу
нястрымны сум
аб тым, што даверана робату.
Мы безліч разоў
пачынаем з азоў,
каб выверыць межы і восі.
Безліч разоў —
цяжкіх тармазоў!
А робат — адрэжа на восьмым!
Адрэжа.
І тумблеры шчоўкнуць усе.
Імгненне.
І шар зямны аблысеў.
І ўвачавідкі спасцігнецца сэнс
праклёну — прапасці пропадам.
Што дзень прынясе,
калі пакрысе
людзей падпарадкуюць робаты?



Ліхтаршчык-вечар зоры зацяпліў,
Каб асвяціць сусветную бясконцасць.
Я сёння — мора. На душы — адліў,
І вось яна — агалена да донца.

Адлегласць, час, прасторы крывізну —
Усё ў сабе нясу па-чалавечы.
І раздаю душы сваёй казну —
Няма другой, не муляе мне плечы.

Дзялюся ўсім, што розум мой спасціг,
Што не адкінуць памяці, не сцерці.
Сусвет пульсуе. Вечнасць — толькі міг
Між першым і другім ударам сэрца.

Ударам сэрца вымяраем час.
Згараюць зоры ў небе — нібы свечкі.
Якая вечнасць можа быць без нас? —
Якая вечнасць?..

ВЕРШ
УДЗЯЧНАСЦІ
ПІМЕНУ ПАНЧАНКУ

І страшна падумаць,
і страшна паверыць
ва ўсё,
што было між людзьмі.
І што будзе?
І страшна,
як б'ецца аголена сэрца,
і страшна,
як б'юць па аголеным сэрцы,
якое з любоўю
аддадзена людзям.

Абпалена горла
пакутаю песні.
Як можна?!
Не пляскайце полымю ў ладкі!
Хвіліну маўчання! —
І сэрца васкрэсне,
любоў уваскрэсне.

І ўбачаць нашчадкі:
Як бацька
гатовы быў сына праклясці,
як рвалі мы жылы,
як рвалі нам нервы,
як страшна было —
узляцець,
а не ўпасці,
як мы адраджаліся
Сорамам з Гневам.

ТЭАТР ЛЯЛЕК

Ад сябе адракаюся,
Падаю ў бездань.
Вашым гукам і рухам
Не патраплю я ў лад!
А ў той бездані — праўда,
А ў той бездані — песні
Ды адзіная мара —
Не вяртацца назад.

І адзіны ёсць страх —
Прыпыніцца, прачнуцца,
Як у здрадлівых снах,
Дзе вастрэй ад ляза
Паласне па жыццю:
«Яшчэ можаш вярнуцца!» —
Хто глыбіні спазнаў,
Не прыходзіць назад.

Не прыходзіць рака
У абдымкі вытоку,
Не вяртаецца ў неба
Раскуты прамень.
...Зала пляскае ў ладкі...
Абарвіце вяроўку!
Адпусціце мяне,
Не цягніце мяне!

ЮНАЦТВА

Край задумлівых верб
Чорнай гладдзю рачной
Ціха месяц плыве
Побач з лодкай маёй.

За лукой, дзе чарот,
Пралеглі астраўкі.
Паласою на ўзлёт —
Маякі, маякі.

Цягне дымам кастра,
Пахне зёлкамі золь...
Так далёка да страт.
Гэтак блізка да зор.

ЗАТОКА ГАРЛАЧЫКАЎ

Кут вербалозавы,
Тайна юначая,
Мілая, росная
Прыстань гарлачыкаў!

Сцежка мурожная,
Цішай спавітая,
Што растрывожыла
Мроі нязбытныя?

Вёслы пад кладкаю,
Лодка на беразе
Шэпчуць загадкава:
«Ведалі — вернешся...»

Сэрцу сумуецца,
Сэрцу світаецца...
Як растлумачыць вам? —
Мы не вяртаемся...

НА КАНЦЭРЦЕ КАНАДСКАГА ГІТАРЫСТА Ў САФІЙСКІМ САБОРЫ

...И, если сердце, разрываясь,
Без лекаря снимает швы,
Ты знай — от сердца голова есть
И есть топор от головы...

М. Цвятаева

Чужынец белаю рукой
Крануў струну, як у знямозе...
А я — у бога на парозе
Стаю з працягнутай душой.

Ля праху грэшных і святых
Што да Вівальдзі мне і Баха,
Як, заміраючы ад страху,
Шукаюць вочы воч тваіх!

На час адзін над намі дах.
А ты — з другою, непрыгожай,
Такою гордай і варожай,
Што нават мне яе шкада.

І я кляну сябе: маўчы,
Кусай, кусай сухія вусны!
А ты, адсекшы галаву мне,
Прашу — і сэрца адсячы...

ВЕРАСЕНЬ

Конь.
Туман.
Таемны бляск ракі.
Неруш.
Купы дрэў маўчаць аб нечым.
Павуцінне ў росах трапяткіх.
Па зямлі іду?
Ці Шляхам Млечным?
Вечнасць — на адлегласці рукі.

ЛІСТАПАД

Сумуецца клёну:
Што клёну без лісця?
Сумуецца клёну —
У клёна восень.

У роздуме поле:
Што полю без жыта?
Маркоціцца поле —
У поля восень.

Трывожыцца неба:
Што небу без птушак?
Надзьмулася неба —
У неба восень.

Сціскаецца сэрца
Ад жалю да клёна,
Да поля і неба —
У сэрца восень.

У ДАРОЗЕ

Аўтобус ехаў нібыта ў нябыт.
Насустрач — аніводнае машыны.
Бясконца слаўся мяккі аксаміт
Снягоў і неба колерам мышыным.

Не пазабыцца мараю ці сном,
Бо чорныя таўсцеразныя ліпы
Закрэслівалі колер гэты сціплы,
Разліты за аўтобусным акном.

Па ўзгорках, на скуластае зямлі
Вільготныя праталіны ляжалі,
І рушылі не мы, а наязджалі
Акном абмежаваныя камлі.

Здавалася, што звузіўся прасцяг,
І ноч і дзень здаваліся падманам,
Але зара паўстала з забыцця
Над талымі снягамі і туманам.

І ў небе запляскалася крыло,
І зерне зварухнулася пад жвірам...
Загаманілі разам пасажыры
Пра ўсё, чаго было і не было...

ДАРОГА НА ХУТАР

Бездань цемры.
Вятроў скавытанне.
Імжа.
Можа, лепей вярнуцца?
Счакаць да світання?
Варажба даганяе.
Сціскае дыханне.
Толькі тата б сказаў:
«Гэта, братка, не жах.
Як жывы, то не жах.
Ну, а мёртвыя — жаху не знаюць».

Зрок адняты.
А крок — нібы крок да нажа.
І няма ні прасторы, ні часу, ні слова.
Адзінота па душы выходзіць на ловы.
І кажу я сабе:
«Гэта, братка, не жах.
Як жывы, то не жах.
Ну, а мёртвыя — жаху не знаюць».

Хутка скончыцца ноч.
Ды не скончыўся шлях,
Дзе, напэўна, часінай журбы ці адчаю
Паўтару я сабе,
Як цяпер паўтараю:
«Гэта, братка, не жах.
Як жывы, то не жах.
Ну, а мёртвыя — жаху не знаюць».

ЗМЕСТ

Сыны 3
«Ёсць хлеб у нас. І ёсць да хлеба-солі...» 5
У клічаўскіх лясах 6
Балада пра нараджэнне Беларусі 7
Роздум у краязнаўчым музеі 9
Песня вечнага цыгана 10
У карціннай галерэі 14
«Няма душы?..» 15
Балада пра відушчых і сляпых 16
Дома 19
Першы пацалунак 20
Успамін пра карусель 21
Аднакласнікам 22
«І чаму ў гэтым свеце расстайным...» . . . 24
«Зацягне ў вір, звядзе ў гушчар...» 25
«Навагодняя ноч. Гасне тэлеэкран...» 26
«Знікае, растае ў змярканні твар...» 27
«Абрывы грозныя...» 28
«Стань да святла, прашу я, стань!..» 29
«Ад воч маіх, ад рук...» 30
«— Адпусці!..» 31
«Ты не са мной. Пагашана святло...» 32
«Абыду, адыду, саступлю...» 33
Сустрэча 34
«Гуляе непагадзь...» 35
«Чалавечае ўсё...» 36
Згадка 37
На дваіх 38
«Цяпло на зломе, восень залатая...» 39
Пацерчына замова 40
Бабіна лета 41

Балада пра два маўчанні 42
З сынам у парку 43
Скрыпач 44
Ранак мастака 45
Споведзь снягуркі 46
Красавіцкая дарога 47
«Усмешкай растрывожана...» 48
«Скрыжоўвалі мы позіркі не раз...» 49
«Скончыўся дзень...» 50
«Гэта ты, а не вецер прарваўся ў акно...» . . 51
Прытча пра кветку 52
Сезам 53
Вечар 54
«Рука ў руцэ...» 55
Мой разлік 56
Бывай, зіма! 57
Вясновы матыў 60
«Ты чуеш, сяструха...» 61
Дзяўчо і раўчук 63
Паводка 65
Бэз 66
«Прабіўся з цеснага жытла...» 67
Дэльтапланерысты 68
«О, не пытай дарэмна, не суроч...» 69
« — Чакай, не трэба, не кажы!..» 70
«Мора дыбіцца...» 71
«А мы не запомнілі назвы гары...» 72
«Ноч надышла не проста зменай дня...» . . . 73
«Восень, восень...» 74
«Падатлівая? Цвёрдая?..» 75
«Паміж намі сумненняў роздумы...» 76
Вучуся раўнавазе 77
«Не вымярай маёй віны...» 78
«Поўнюся сонечным зайчыкам шчасця...» . . 79
«Падчас самоты...» 80
«За лясною прысадай...» 81

Лета-медуніца 82
Гарадская бяроза 83
«Хто хоць аднойчы адолеў вяршыню...» . . . 84
Касцяпіцы 85
«Яшчэ не зусім адбуяніла лета...» 86
«Поўніць істоту...» 87
Цесля 88
Сонейка ў росах 90
«Што чысцей, чым крыніца, паветра і снег?..» 91
Арэлі 92
Полацкая Сафія 93
Сыну 94
«Як толькі зоймецца паўкруг...» 95
Права выбару 96
«Хоць мноства дум...» 97
«Ліхтаршчык-вечар зоры заццяпліў...» 98
Верш удзячнасці Пімену Панчанку 99
Тэатр лялек 100
Юнацтва 101
Затока гарлачыкаў 102
На канцэрце канадскага гітарыста ў Сафійскім саборы 103
Верасень 104
Лістапад 105
У дарозе 106
Дарога на хутар 107

Паўлікава Л.

П 12 Тваё святло: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1988.— 110 с.

ISBN 5-340-00057-5

Павликова Л. Твой свет: Стихи.

У гэтай кнізе знайшла сабе прытулак пяшчотная і гордая, шчырая і зманлівая, суцяшальная і бунтоўная, вольная, са звонкімі ўсплёскамі радасці і глухімі перакатамі журбы непаўторная мелодыя жаночай душы.

П $\frac{4702120200-069}{М\ 302(03)-88}$ 57—88 ББК 84 Бел 7

Литературно-художественное издание

**ПАВЛИКОВА
ЛЮДМИЛА ФЕДОРОВНА**

ТВОЙ СВЕТ

Стихи



Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**ПАЎЛІКАВА
ЛЮДМІЛА ФЕДАРАЎНА**

ТВАЁ СВЯТЛО

Вершы

Рэдактар Л. В. Дранько-Майсюк
Мастак Н. У. Кавалёва
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар А. Б. Барадзіна
Карэктар Л. П. Бялова

ІБ № 2995

Здадзена ў набор 29.10.87. Падп. да друку 22.02.88. АТ 09537. Фармат 70×90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 4,10. Ум. фарб.-адб. 4,25. Ул.-выд. арк. 3,04. Тыраж 2300 экз. Зак. 910. Цана 30 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.